3. Підручник.ком.юа [Электронный ресурс]. URL: https://pidruchnyk.com.ua/ (дата обращения 18.09.2023).

# ЧАС У ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЯНІНА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ЯКУБА КОЛАСА)

# THE TIME IN THE SPACE OF THE BELARUSIAN PEASANT (ON THE EXAMPLE OF THE WORKS OF JAKUB KOLAS)

***С.В. Чувак***

***S. Chuvak***

Гродненский государственный университет им. Я. Купалы,
Гродно, Беларусь, *sv_chuvak@grsu.by*
Yanka Kupala State University of Grodno,
Grodno, Belarus, *sv_chuvak@grsu.by*

Артыкул прысвечаны аналізу катэгорыі часу ў прасторы светапогляду беларускага селяніна на прыкладзе вобразаў беларускага сялянства ў творах Якуба Коласа. Разглядаецца час штодзённы, прафанны і час святочны, sacrum. Аналізуюцца маркеры пераходу часу featured стану.

*Ключевые слова*: тэмпаральнасць; Якуб Колас; вобразная сістэма; беларускі селянін; час-sacrum.

The article is devoted to the analysis of the category of time in the space of the worldview of the Belarusian peasant on the example of the images of the Belarusian peasantry in the works of Yakub Kolas. Everyday time, profane, and festive time, sacrum, are considered. Time transition markers of different states are analyzed.

*Keywords*: temporality; Yakub Kolas; figurative system; Belarusian peasant; time-sacrum.

Успрыманне часу ў значнай ступені абумоўлена спецыфічнасцю галоўнага занятка селяніна – працай на зямлі. Залежнасць ад прыродных ўмоваў, іх рытмаў, змены аднаго каляндарнага цыкла другім прадвызначылі і разуменне руху часу ў сялянскай культуры.

Першым найбольш істотным падзелам часу выступае парадак працы. Ён строга дэтэрмінаваны цыклічнасцю зменаў пораў года. Селянін працуе і плёнам яго працы з'яўляецца нараджэнне новага жыцця. Сялянскі год пачынаецца вясною, парою абуджэння ад сну:

З лазурных чыстых небясоў
Прыветна сонейка глядзіць,
Ва ўсе канцы лье блеск лучоў,
Цяпло і свет зямлі дарыць
І кліча к жыццю ўсё стварэнне
З сваёй крыштальнай вышыні,
І будзіць кліч той аддаленне
Прызывам радасным вясны [1, с. 378]

Як час нараджэння новага жыцця вясна для селяніна поўніцца надзеямі і чаканнямі новага багата ўраджаю. У лірыцы Коласа чаканне вясновага адраджэння сугучнае з абуджэннем народу, уздыму яго ад векавогу сну, “дрэмы” (вершы “Закліканне вясны”, “Песні вясны”). Лета ў паказе мастака – самы прыгожы час году, калі прырода аддае зямлі ўсё, для чалавека ж гэта самы адказны час, калі трэба ўсё рупліва сабраць. Летняя пара вымалявана Коласам у самых розных часавых нюансах: узыход сонца, раніца, гарачы поўдзень, вечар, ноч. Уся раскоша, прываблівасць, чароўнасць зямнога жыцця знайшла адлюстраванне ў раздзеле “Летняю парой” паэмы “Новая зямля”. Лета – апагей сялянскага году, самы важны і адказны час: касавіца, жніво, грады, грыбы, ягады, падгляд пчол, зёлкі і многае іншае, што забяспечыць дабрабыт селяніна на ўвесь год. Лета – пара, калі селянін працуе ад раніцы да ночы. Яго галоўны сімвал – сонца. Яно шчодра лье на зямлю “гарачы і яскравы бляск”[6, с. 210] Шчырасць сялянскай працы зліваецца ва унісон з шчырасцю прыроды, якае аддае чалавеку свае скарбы:

Я шчасця большага не знаю,
Ці знаць яго ўжо не прыйшлося,
Як толькі тут, на сенакосе.
А глянь на луг пад вечар, браце!
Увесь, як ёсць, ва ўсім ахваце,
Па ўсіх грудах аж за дарогу
Устаўлен копамі мурогу;
…Павее ветрык – што за пахі!
Мёд разліваюць тыя гмахі,
Віно найлепшае і ром,
Як плата шчырая касцом [1, с. 211]

Скошаныя лугі, заціхлыя сенажаці, птушкі, якія збіраюцца ў вырай – сведчанні заціхання жыцця, “зніканне лета”. Восень атаясамліваецца Коласам з вельмі ёмістым ў традыцыйнай культуры вобразам свякрові:

На ніцях белай павуціны
Прывозяць восень павучкі.
Яе красёнцы, чаўначкі
У моры лесу мільгатнулі
І лісце ў багру апранулі;
І з кожнай лісцевай галоўкі
Глядзіць твар восені-свякроўкі [1, с. 119]

Восень скупая на фарбы, “то не музыка вясны, а ціхі жаль і нараканне” [1, с. 120]. Гукі і фарбы сцішваюцца, знікаюць і на іх месца прыходзіць поўная нерухомасці і цішыні зіма. Паказальна, што менавіта

здольнасцю перамяшчацца вызначаецца вартасць той ці іншай пары году. Вясна, лета – поры бесперастаннага руху, абнаўлення, а восень і асабліва зіма – час, калі прырода нямее, “мяртвее”:

Усё ціха, мёртва, нерухома.
Сядзіць звяр’ё між буралома
І знака жыцця не пакажуць,
Вароны дзюба не развяжуць,
Усе нахахорацца, ні зыку –
Уладарства холаду вяліка [1, с. 162]

Такім чынам, праз працу чалавек уключаецца ў вечны рух прасторы, у цыкл нараджэння жыцця ў Сусвеце. Яго асабісты, індывідуальны час пераплятаецца са зменлівасцю бясконцай прыроды. Час прыродны рытмічны, г.зн. вяртаецца і паўтараецца, іншымі словамі адбываецца тое, што павінна адбыцца. Жыццё селяніна ідзе па прадвызначанаму колу цыклаў сялянскай працы, якія непарыўна звязана з прыродай. Гэта плынь часу выходзіць за межы жыцця чалавека. Цыклічнасць так надзейна ўсталявана, што стала вымяральнікам для “непрацоўнага” часу: сезонамі касьбы ці малацьбы вымяраецца жыццё селяніна. Стары Юрка з апавядання “Бунт” акрэсліў час, калі сяляне валодалі ўрочышчам, як “пяцьдзесят панскіх ніў вырасла на гэтым полі” [2, с. 20]. Вось як піша Колас пра аддаленасць часу маладаосці і кахання дзядзькі Антося:

Даўно пажалі тое жыта
І тыя межы зааралі,
Што дзядзькаў смутак калыхалі [1, с. 139]

Яшчэ адным парадкам руху часу выступае змена вялікіх гадавых святаў і прысвяткаў. Да іх далучаецца неад’емнай і вельмі значнай часткай чалавечыя звычаі, кірмашы. Гэты ход таксама ўтварае асаблівы калазварот, які стварае рытм, а не ход падзей. У творах Якуба Коласа знайшлі поўнае адлюстраванне самыя значныя святы – Каляды і Вялікдзень. Гэтыя святы маюць дваістую прыроду. Па сутнасці, яны рэгламентуюцца правіламі супольнасці, належаць да культуры грамадскага жыцця, паказваюць перавагу санкцый грамадства над воляю індывіда. Рытуал святкавання дастаткова падрабязна рэгламентаваны, уключае ў сябе як элементы побытавай культуры (навядзенне парадку, гатаванне неабходных рытуальных страваў і г.д.), так і шэраг хрысціянскіх духоўных практык (напрыклад, напярэдадні Вялікадня трэба паспавядацца, маліцца, абавязкова наведаць царкву, асвяціць святочныя стравы, пабыць на начным набажэнстве). Паўтаральнасць і рытмічнасць гэтага ходу больш жорсткая чым сувязь з прыродаю, бо святы не могуць спазняцца. Хоць у творах Я.Коласа

заўважаем, што для селяніна галоўным маркёрам любога свята выступае забарона працы. Так, сяляне вёскі Цельшына ў трылогіі “На ростанях” не маглі дакладна вызначыць, калі ж святкаваць чарговы прысвятак і вось як прычытала старая Лукашыха: “…А я ж думала, што заўтра! Лукаш мой даўно пайшоў у клуню грэчку малаціць!.. І сама я ўсю раніцу прала!..Усе людзі святкуюць, адна я, як тая дурная калатоўка, соваюся: ні *свята*, ні *спакою* ні бачу”[3, с. 49]. Мы падкрэслілі пару, якая дае нам тлумачэнні сутнасці сакральнага часу. Праца – гэта рух, дзеянне, гукі, будзённасць, а *свята* – гэта *не праца*, *спакой, цішыня, урачыстасць.*

Маркёрам падзелу на працу і свята з’яўляецца алкаголь. Ён можа мець рытуальны характар у свята і тады мае станоўчае значэнне:

Мы заўсёды выпівалі
І гарэлку шанавалі, -
Так вядзе ад дзядоў.
Чуць на свет ты паказаўся,
Яшчэ ў ночвах не скупаўся,
А ўжо кажуць: “Будзь здароў!”
…А памрэ ён, чуць сканае,
Жыць на свеце не ўздужае, –
Зноў з’яўляецца яна [1, с. 321]

Нерытуальны характар выпіўка набывае тады, калі ўжываецца ў працы, пры гэтым набываючы негатыўнае, асуджальнае значэнне: чалавек, які ўжывае алкаголь пры працы не з’яўляецца працаўніком. Злоўжыванне гарэлкай вядзе да дэградацыі асобы, страты самасці, пагражае не толькі жыццю і здароўю чалавека, але і ўплывае на аўтарытэт у вачах грамады. Я.Колас выдатна разумеў праблему алкагалізацыі сялянскага асяроддзя, таму шырока, часцей за ўсё і ў іранічным ключы адлюстраваў яе ў сваіх творах – апавяданні “Кірмаш”, “Недаступны”, вершаваны фельетон “Змаганне з пьянствам”, вершы “Пахмелле”, “Песня п’янага” і інш.

Каляндарныя святы ва ўяўленнях селяніна нясуць істотныя адзнакі прыроднага асяроддзя. Па-першае, наваколле разам з людзьмі сустракае і спраўляе свята, мае тыя ж клопаты, што і людзі. Усё набывае іншы выгляд, па-новаму гучыць: “…у гэту ноч і месяц не падымаўся; можа ён пёк сабе дзе-небудзь пірагі і бабкі на вялікдзень, павярнуўшыся спінаю да зямлі. А што належыць да зорак, то яны хоць і былі на небе, але пазакрываліся хмарамі. Можа яны там мыліся ды прычэсваліся – іх дзявочая справа” [3, с. 119]. Па-другое, святы захавалі сувязь са старажытнымі паганскімі ўяўленнямі. Напрыклад, Каляды засталіся ва

ўяўленні сялян часам, калі можна варажбою даведацца аб будучым, прыадкрыць таямніцу невядомага:

А на стале, ў драбнюткі сене –
Здавён-даўна вялося й гэта –
Уважна зернеткі шукалі
І па тых зернетках гадалі,
Які зародзіць хлеб налета [1, с. 175]

Яшчэ адным істотным атрыбутам такіх святаў выступае магія слова. Гаспадар да ўсіх звяртаецца з зычэннямі самага важнага:

Няхай дае бог лад у хаце,
Дабра, прыбытку прыспарае,
Каб у хляве ды ўсё пладзілась,
Каб жыта ў полі каласілась,
Няхай раяцца добра пчолы,
І самі будзем мы вясёлы;
За год дай божа дачакаць
Здаровы новы год спаткаць [1, с. 173]

Мы змясцілі найбольшую слоўную формулу, у якой выразна прасочваецца цыклічнасць свята (гаспадар зычыць на год), дастаткова падрабязнае пералічэнне усяго, што павінна пладзіцца і памнажацца паказвае на захаванне анімістычных вераваннняў у магію слова – тое, што вымаўлена мае сімвальны, магічны характар і абавязкова здзейсніцца. Характар застолля таксама сведчыць аб захавання архаічнага правіла – падобнае выклікаецца падобным. Незалежна ад маёмаснага ўзроўню сяляне імкнуцца, каб на святочным стале было самае найлепшае. Так і да сённяшняга дня захавался традыцыя на Каляды калоць парася. Раскоша святочнага стала, разнастайнасць страваў колькасная і якасная павінны былі забяспечыць на цэлы год дастатак у сялянскай сям’і:

Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя з лета.
Але не ўсё яшчэ і гэта:
Аздоблен квас быў і грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі;
Цыбуля, перчык, ліст бабковы –
Ну, не ўясісь, каб я здаровы! [1, с. 174]

Звычаёвы парадак часу не абмяжоўваўся толькі царкоўнымі святамі, прысвяткамі ды нядзеляй, ён уключаў мноства іншых, прынятых у групе, нагодаў для святкавання, якія могуць “лакалізавацца“ ў прасторы сям’і або сваёй лакальнай вясковай прасторы. Так, у раздзеле “Падгляд пчол” заўважаецца крыху дзіўная сітуацыя. Палясоўшчык Міхал, яго госці паводзяць сябе па-панску: вітаюцца праз “проша” [1, с. 109], “за стол не лезуць для паказу, бо так шляхетнасць вымагае” [1, с. 112], гаспадар “руку прыгнуўшы над камзэлькай, на панскі лад мяце-вальцуе, усіх далікатнасцю касуе” [1, с. 116]. Уяўленні сябе панамі і адпаведныя паводзіны найперш звязана з разуменне жыцця паноў як свята. Па гэтай прычыне, святкуючы, сяляне імкнуцца набыць характарыстычныя адзнакі ў стылі паводзінаў, мове, адзенні.

Наогул, усе каляндарныя святы замацоўваюць пачуццё салідарнасці ў групе, пачуццё еднасці з супольнасцю дадаткова падкрэсліваецца песняю і танцамі.

Парадак гэтай часавай плыні ідэнтычны з парадкам сельскагаспадарчых работ, мае характар рытму, бо кожны яго складнік паўтараецца і вяртаецца. Гэтыя два рытмы працы і свята ідэнтычныя: першы кіруе чалавекам ў працы, другі – чалавекам у адпачынку.

Важна, што парадак працы – гэта парадак прыроды, які дадзены чалавеку і супольнасці, парадак звычаёва-святочны – парадак культуры, створаны грамадою, якой трымаецца адзінка. Абодва яны маюць характар рытму, але гэта з’явы абсалютнай рознай анталагічнай якасці. Істотнае, што ўсё ў жыцці селяніна вартае таго, каб паўтарыцца: нядзеля, святы, танцы і г.д.

Селянін праз спасціжэнне навакольнага свету імкнецца да індывідуалізацыі. Усе поры года, важныя перыяды жыцця маюць ва ўяўленні селяніна ідэнтычнасць, якая выражаецца ў надаванні ім імёнаў. Адбываецца антрапамарфізацыі часу. Дзякуючы такому ўспрыманню час становіцца часткаю прыроды, індывідуалізуецца.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Колас Я.* Збор твораў: у 20 т. Т. 5: Апавяданні, 1906-1924. Мінск : Беларус. навука, 2008.
2. *Колас Я.* Збор твораў: у 20 т. Т. 8: Паэма "Новая зямля". Мінск : Беларус. навука, 2009.
3. *Колас Я.* Збор твораў: у 20 т. Т. 13: Трылогія «На ростанях»: кн. 1-2. Мінск : Беларус. навука, 2011.